## LEGAL INTEREST AS A LEGAL CATEGORY

**© 2019 V. V. MATSIUK[1]**

*The Belarusian State Agricultural Academy, Gorki, Belarus*
*[1]E-mail: matsiuk_sl@rambler.ru*

The author's approach to the category of legal interests is an attempt to incorporate legal interests into the system of the mechanism for the legal regulation of public relations. It is noted that as long as there is no legal relationship and a subjective right in its composition, there is no possibility to appeal to the right (right) of a claim and the whole mechanism of protection of subjective right, and, therefore, it can only be a matter of protecting a legal (protected by law) which (in its narrow sense) is expressed in the opportunity provided by the law to strive to do what the hypothesis of this or that rule of law describes in its most general form, that is, to strive to "create" legal facts separately or their combination, necessary and d cient for the occurrence of a particular relationship.

**Keywords:** legal interest, interest in law, interest protected by law, mechanism of legal regulation of social relations, interest protected by law, interest protected by law, subjective right, system of social regulation, values, legal fact.

УДК 94(4)072

## УПЛЫЎ ІНСТЫТУТА ПРЫГОННАГА ПРАВА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ НА ЎРБАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯЎ

**А. В. КІСЯЛЁЎ[1]**

*УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія», Горкі, Беларусь*
*[1]Эл. адрас: solo225@rambler.ru*

**Мэта даследавання** – устанаўленне асаблівасцяў, эвалюцыі і арганізацыі ўнутранага гандлю на беларускіх землях Вялікага Княства Литоўскага ў XVI – першай палове XVII стагоддзяў. Вобласць выкарыстання. Гісторыя Беларусі, гісторыя ўсходніх славян.

**Ключавыя словы:** Беларусь, Вялікае Княства Літоўскае, гандаль, рынак, грошы, нерухомасць, вексель, купецтва, прасолы, цэны, даходы, права, магазін.

### Уводзіны

На працягу XVI–XVII стагоддзяў ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе адбываюцца працэсы, якія Ф. Энгельс назваў «другасным запрыгоньваннем сялянства» [11, с. 56]. Калі ў Заходняй Еўропе на працягу XIII–XVI стагоддзяў адбываецца вызваленне сялянства ад прыгоннай залежнасці і замена адпрацовачных павіннасцей грашовымі выплатамі (так званая камутацыя рэнты), то на вялікай тэрыторыі ад Даніі да Сіцыліі з'яўляецца або ўзмацняецца прыгонная залежнасць сялянства. Другаснае запрыгоньванне сялянства назіралася ў Рэчы Паспалітай, Расіі, Венгрыі, Чэхіі, Даніі, Прусіі, Аўстрыі, Неапалітанскім каралеўстве і інш. Заходняй граніцай тэрыторый з прыгонным правам у Еўропе становіцца лінія Гамбург-Вена-Венецыя [13, с. 235].

З эканамічнага пункту погляду, узнікненне і развіццё прыгоннага права ў ВКЛ было звязана са з'яўленнем фальварковай гаспадаркі. У адрозненне ад феадальнага манора Заходняй Еўропы, фальварак быў цэнтрам таварнай, а не

натуральнай гаспадаркі. Прадукцыя, вырабленая фальваркам, у адрозненне ад натуральнай гаспадаркі манора, ішла на продаж [1, с. 183].

З пункту ж гледжання права, якое афармляла гаспадарчы статус гэтага ладу, зямля, маёнткі і самі сяляне аказваліся прыватнай уласнасцю памешчыка. Прычым прыватная ўласнасць распаўсюджвалася і на зямлю, і на асобу селяніна. Юрысты ў гэты час вызначалі гэту залежнасць у тэрмінах прыватнай уласнасці па кодэксу Юстыніяна «Jus utendi et abutendi quatenus juris ratio patitur» [15, с. 9].

**Асноўная частка**

Якую ролю адыгрываў пры другасным запрыгоньванні сялянства капіталізм? Французскі гісторык Фернан Брадэль лічыць, што тэрыторыя Усходняй Еўропы пачала ператварацца ў каланіяльную перыферыю перадавых капіталістычных краін Захаду. Павышаны попыт на зерне на Захадзе вымушаў памешчыкаў на Усходзе пашыраць панскую запашку. У якасці тыповага прыкладу перыферыйнага капіталізму ён бачыць Рэч Паспалітую XVI–XVIII стагоддзяў [6, с. 45].

Сапраўды, гандаль прадуктамі сельскай гаспадаркі быў даволі прыбытковай справай, за якую ўзяліся многія станы тагачаснага грамадства. Сярод іншых вылучаліся прадпрымальніцкія памкненні шляхты – на соймах сярэдзіны XVI стагоддзя яна настойвала на бяспошлінным продажы збожжа і іншых прадуктаў, на ўвядзенні ў гарадах адзінай уніфікаванай меры і вагі на зерне і іншыя прадукты сельскай гаспадаркі. Але пытанне застаецца.

Аднак з многімі тэзісамі Ф. Брадэля не пагаджаецца польскі гісторык Вітольд Куля. Ен, вывучаючы фальваркова-паншчынную гаспадарку на тэрыторыі Польшчы, не знаходзіць у ей такіх рыс капіталізму, як «эканамічны разлік», зніжэнне выдаткаў, наёмная праца, інвестыцыі і іншае. Такім чынам, трэба сказаць, на думку В. Кулі, аб рэфеадалізацыі Рэчы Паспалітай, а не аб перыферыйным капіталізме на яе землях [14, с. 67]. Ф. Брадэль пачынае палемізаваць з В. Куляй на старонках другога тома свайго трохтомніка «Матэрыяльная цывілізацыя, эканоміка і капіталізм XV–XVIII стст.» [7, с. 97].

«Крупный земельный собственник не был капиталистом, но он был на службе у капитализма амстердамского или какого другого орудием и соратником. Он составлял часть системы. Самый крупный польский вельможный пан получал авансы от гданьского купца и через его посредство – от купца голландского. В некотором смысле он находился в таком же подчиненном положении, что и сеговийский овцевод, который в XVI веке продавал шерсть своих баранов генуэзским купцам задолго до стрижки ...» [8, с. 72].

На наш погляд, для таго, каб разабрацца з характарам шляхецкага гандлю Рэчы Паспалітай, трэба разгледзець структуру феадальнай рэнты тыповага шляхецкага фальварку на беларускіх землях ВКЛ. Працы гісторыкаў П. А. Лойкі «Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII стагоддзяў» і В. Ф. Голубева «Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI–XVIII стагоддзяў» паказваюць, што на тэрыторыі Беларусі пераважала змешаная рэнта як у

выглядзе паншчыны, так і натуральнага дзякла і грашовага чыншу [16, с. 96]. Такую ж карціну мы бачым, калі разглядаем інвентары розных маёнткаў феадалаў [2, л. 3]. Чынш пераважаў ва ўсходніх раёнах ВКЛ, а паншчына – у заходніх і ў басейнах вялікіх сплаўных рэк. Па падліках П. А. Лойкі, феадал атрымліваў аднолькавы даход, нягледзячы на форму павіннасцей, у залежнасці ад колькасці зямлі, якую ўтрымліваў селянін [11, с. 16; 18, с. 145].

Такім чынам, землеўласнік як у Заходняй Еўропе, так і ва Усходняй імкнуўся атрымаць ад сваіх уладанняў максімальную суму прыбытку. У Заходняй Еўропе селянін мог прадаць прадукты сваёй гаспадаркі па высокай цане ў бліжэйшым горадзе і выплаціць землеўладальніку рэнту грашыма. Ва Усходняй Еўропе селянін, для таго каб выплаціць тую ж суму пану, вымушаны быў бы прадаць значна больш зерня, чым англійскі або французскі фермер, таму што прадукцыя сельскай гаспадаркі на беларускіх землях каштавала значна менш, чым у заходнееўрапейскіх гарадах. Паколькі ў Заходняй Еўропе назіраўся дэфіцыт зерня, а ва Усходняй Еўропе – яго лішак. Акрамя таго, гарадскія купцы не хацелі канкурыраваць з сялянамі і імкнуліся абмежаваць сялянскі гандаль заканадаўча. Гэта тычылася тых сялян, якія вялі рэгулярны гандаль у горадзе (т.зв. «гандлёвыя людзі»). Аб гэтым сведчыць рэскрыпт Жыгімонта I гарадзенскаму старасце, у якім «Кароль Сігізмундъ I пріпісываеть старосте отсылать вь деревні крестьян, перешедших на жительство в городь і займаюшихся торговлею» [4, л. 45].

Не выключаны быў удзел у гандлі і вясковых рамеснікаў. Але невялікае распаўсюджванне гэтай з'явы было абумоўлена існаваннем у гарадах жорсткай цэхавай рэгламентацыі на гандаль таварамі рамяства.

Асноўным таварам, які вёз селянін на гарадскі рынак, было збожжа. У горада не было вялікіх плошчаў пад вырошчванне сельскагаспадарчых культур, выкарыстоўвалася любая магчымасць для папаўнення сховішчаў. Да таго ж, збожжа адыгрывала значную ролю і ў замежным гандлі. Гарады былі і павінны былі заставацца тым месцам, дзе канцэнтраваліся тавары, у тым ліку і збожжа, перад тым як іх перапраўлялі за мяжу. Дзеля гэтага нават ствараліся спецыяльныя збожжавыя рынкі ў Магілёве, Мсціславе, Гародні. Дарэчы, адносна месца збожжа ў экспарце краіны, у беларускай гістарыяграфіі існуе некалькі пунктаў гледжання. Аб значнай ролі гэтага тавару ў замежным гандлі пісалі У. І. Пічэта, М. В. Доўнар-Запольскі. З. Ю. Капыскі адводзіў меньшую ролю збожжу ў гэтым працэсе. У сваіх даследаваннях ён абапіраўся на мытныя кнігі Бярэсця (1583 г.), Гародні (1600 г.), Коўна (1600 г.), Віцебска (1605 г.) і Полацка (1616 г.) Азначаная праблема не з'яўляецца прынцыповай пры разглядзе пытанняў развіцця ўнутранага рынку краіны [9, с. 124; 12, с. 197; 17, с. 356].

Замежны гандаль зернем апасрэдкавана ўплываў на рынкавыя сувязі горада і вёскі. Набывалі сяляне ў горадзе ў асноўным прадукцыю рамёстваў – косы, сякеры, вазы, адзенне і іншае. З. Ю. Капыскі даволі скептычна ў сваіх працах ставіцца да схемы гандлю паміж горадам і вёскай, згодна з якой селянін у горад вёз збожжа (г. зн. прадукцыю сельскай гаспадаркі), а купляў рамесныя вырабы. Аргументаваў гэта ён тым, што сяляне выраблялі для сябе ўсё самі.

Разам з тым колькасці вясковых рамеснікаў было, відавочна, недастаткова, каб цалкам забяспечыць вёску рамеснымі вырабамі. Да таго ж, як нам падаецца, сялянскія рамесныя вырабы не маглі канкурыраваць з вырабамі гарадскіх майстроў ні па кошце, ні па якасці. Але ж месца на рынку мог мець і селянін. Праўда, часцей ён тут з'яўляўся, каб набыць нейкую рэч непасрэдна пасля продажу свайго тавару. Гэта значыць, што гандлёвая аперацыя насіла хуткатэрміновы характар. Набываць памяшканне дзеля гэтага было б немэтазгодна. Разам з тым ва ўставе Стрэшынскай воласці 1618 года гаворыцца аб трывалым гандлі сялян на рынку; яны захоўвалі свае прадукты ў арэндаваных у мяшчан «каморах».

Такім чынам, бачна, што нерэгулярны і спарадычны сялянскі гандаль не мог забяспечыць жыхароў вёсак грашыма, неабходнымі для выплаты павіннасцей пану ў выглядзе чыншу. Для таго каб прадаць зерне ва Усходняй Еўропе па максімальна выгадным кошце, трэба было яго везці ў Гданьск, Рыгу або Крулявец. Такіх магчымасцяў у селяніна не было, але пан гэта зрабіць мог. Таму адпрацовачныя павіннасці былі выгадныя як гаспадарам, так і іх падданым. Шляхта, згодна са статутам ВКЛ 1566 года, дабілася права бяспошліннага гандлю прадуктамі сваіх фальваркаў, што яшчэ больш павялічвала яе магчымасці перад сялянамі [4, л. 42].

Можна сказаць, што эканамічная роля ВКЛ у міжнароднай сістэме падзелу працы аказала ўплыў на развіццё сацыяльных інстытутаў у дзяржаве. Пашырэнне тыпова феадальных інстытутаў (прыгоннае права, магдэбургскае права, цэхі і іншае) у XVI–XVII стагоддзях ва Усходняй Еўропе стала вынікам наяўнасці свабодных зямель, якія можна было выкарыстоўваць для вырошчвання зерня і яго экспарту. У тым выпадку, калі замест зерня экспартаваліся іншыя тавары, напрыклад, футра, лён, поташ або драўніна, як было на ўсходзе Беларусі ў Падзвінні і Падняпроўі, то замест паншчыны пераважалі іншыя формы рэнты ў выглядзе даніны або чыншу. На думку даследчыка В. Ф. Голубева, на высокую ўдзельную вагу даніны і грашовага чыншу ў структуры сялянскіх павіннасцей уплывала тое, што на ўсходзе Беларусі знаходзілася вялікая колькасць замкаў, гарнізонаў, якіх трэба было ўтрымліваць як грашыма, так і прадуктамі [16, с. 98]. Такая думка з’яўляецца ў цэлым слушнай, аднак трэба мець на ўвазе і пытанні, звязаныя з развіццём ўнутранага гандлю на тэрыторыях беларускага Падняпроўя і Падзвіння. Футра ў якасці тавару з’яўляецца больш кампактным і таму дае меншыя затраты ў час транспартыроўкі. Значыць, цэны на футра на ўнутраным рынку ВКЛ з’яўляюцца больш высокімі ў параўнанні з зернем, што дае магчымасць сялянам яго прадаваць і выплочваць чынш [19, с. 319].

Акрамя росту агульнай колькасці гарадоў і павелічэння гарадскога насельніцтва, у перыяд, які мы разглядаем, адбываецца працэс надання беларускім гарадам правоў на самакіраванне часцей за ўсё ў выглядзе Магдэбургскага права. У залежнасці ад колькасці насельніцтва гарады мелі розную ступень канцэнтрацыі рамеснай вытворчасці і гандлю. У дробных гарадах рамяство і гандаль развіваліся слабей, чым у буйных і сярэдніх. Знач-

ную ролю тут выконвалі сельскагаспадарчыя заняткі. Дробныя гарады ў сваёй гандлёвай дзейнасці арыентаваліся на больш лакальную тэрыторыю [5, с. 101].

Разглядаючы эканамічныя працэсы ўнутры горада, трэба спыніцца і на структуры гарадскога насельніцтва. Для гэтага спачатку трэба разгледзець крыніцы папаўнення беларускіх гарадоў новым насельніцтвам. З дадзенага пункту погляду, гараджан можна падзяліць на тры катэгорыі:

1) нашчадкі мяшчан;

2) перасеrange ў горад сельскае насельніцтва;

3) замежныя падданыя, якія змянілі месца жыхарства.

У феадальным грамадстве нашчадкі мяшчан атрымлівалі ў спадчыну ад бацькоў не толькі маёмасць, але і сацыяльны і юрыдычны статус. Аднак хуткае эканамічнае развіццё беларускіх зямель ВКЛ у XVI – першай палове XVII стагоддзяў прыводзіла да недахопу рабочай сілы ў гарадах. Таму гарады вымушаны былі прыцягваць працоўную сілу звонку. Сельскае насельніцтва трапляла ў гарады пераважна двума шляхамі. У першым выпадку феадалы самі перасялялі сельскіх рамеснікаў у гарады для таго, каб скарыстацца прывілеваным статусам горада як цэнтра рамяства і гандлю і павысіць свае даходы, атрымліваючы падаткі ад новых гараджан. Пераведзеныя феадалам сельскія жыхары часцей за ўсё сяліліся на землях, якія знаходзіліся ва ўласнасці феадалаў, і на гэтыя тэрыторыі не распаўсюджвалася ўлада магістрата. Так узнікалі юрыдыкі [22, с. 45].

Юрыдыкі ўзбагачалі феадалаў, але падрывалі фінансы гарадскіх магістратаў. Таму кіраўнікі гарадскога самакіравання імкнуліся пры дапамозе каралеўскай улады ліквідаваць гэты сацыяльны інстытут. Вярхоўная ўлада была таксама не зацікаўленая ў змяншэнні колькасці падаткаплацельшчыкаў і падтрымлівала пазіцыю магістратаў. Напрыклад, каралева Бона ў 1540 годзе забараніла ў Гародні прыватныя юрыдыкі, мець нерухомую маёмасць у горадзе дазвалялася толькі той шляхце, якая жыла ў сваіх хатах. Жыгімонт III выдаў прывілей пінскім царкоўным мяшчанам, згодна з якім яны былі вызвалены з-пад улады мясцовага епіскапа, і адбыўся іх пераход пад магістрацкую юрысдыкцыю. У жніўні 1633 года, згодна з прывілем караля Уладзіслава IV, прыватныя юрыдыкі былі ліквідаваныя ў Крычаве, а іх насельніцтва было пераведзена пад уладу магістрата [11, с. 57]. Аднак слабасць цэнтральнай улады ў Рэчы Паспалітай не дазваляла ёй ліквідаваць юрыдыкі як прававы інстытут. Большасць насельнікаў юрыдык займаліся рамяством і гандлем, а не сельскай гаспадаркай [23, с. 46].

З сярэдзіны XVI стагоддзя ў ВКЛ з'яўляюцца цэхі. Дакладней казаць, рамесныя аб'яднанні, якія існавалі і раней, бяруць за форму сваёй арганізацыі асноўныя прынцыпы заходнееўрапейскай цэхавай сістэмы. Яе ўсталяванне тут паўплывала на развіццё і арганізацыю гандлёвай справы. Праявілася гэта ў нармаванні гандлёвых заняткаў рамеснікаў. Так, напрыклад, ва ўставе цэха маслабойнікаў Магілёва 1583 года апошнім дазвалялася прадаваць іншаземным купцам «без ведомості старостиной» толькі пяць глякаў алею. В. І. Мялешка тлумачыць гэтае абмежаванне тым, што купецкая вярхушка магістрата была сама зацікаўлена ў набыцці алею (потым яна пастаўляла тавар на рынкі

Прыбалтыкі). Ва ўставе цэха залатых спраў майстроў, кавалёў, кацельшчыкаў, латуншчыкаў, слесараў, майстроў па вырабе гадзіннікаў, збройнікаў і нажоўшчыкаў Мінска гаварылася аб тым, што ніводны каваль не мае права вырабляць для лаўнікаў на перапродаж з іх жалеза заступаў, рыдлёвак, матыг, цэпаў і шэраг іншых рэчаў. Яму дазвалялася вырабляць тавар толькі для свайго дома і лаўкі [24, с. 163].

Адной з адметных рысаў цэхавай арганізацыі была сістэма абмежавання вырабу і продажу тавараў, закупкі сыравіны. Гэта было абумоўлена эканамічнымі магчымасцямі таго ці іншага горада, асаблівасцямі канкрэтнага рамяства. Чым менш быў попыт на рынку, тым больш майстар працаваў на заказ і тым болей падрабязна яго абавязкі прапісваліся ва ўставе цэха [10, с. 202].

Цэхі баранілі сваіх майстроў у пытаннях набыцця сыравіны. Так, напрыклад, Берасцейскі цэх гарбароў забараніў мяшчанам набываць на рынку футра, пакуль майстры не набудуць неабходную колькасць сыравіны. Гэта, на наш погляд, яскравы прыклад абароны карпаратыўных інтарэсаў асобнай групы грамадства. Гэта быў натуральны працэс – працэс аб'яднання, у дадзеным выпадку рамеснікаў, дзеля ўтрымання мясцовага рынку ў сваіх руках.

Дарэчы, больш азначанай ва ўставе колькасці (гэта значыць – пра запас) майстар набываць футра права не меў. У Магілёве, па звестках В. І. Мялешкі, згодна з уставам цэха гарбароў, не дазвалялася майстрам і вучням купляць сыравіну ў нядзелю ў першай палове дня. Не дазвалялася таксама набываць яе ў прадмесці, на вуліцах і ў дамах. Рабіць гэта рамеснікі павінны былі на гарадскім рынку ў строга азначаны час. Шаўцам, збройнікам, мяснікам, слесарам і кацельшчыкам Магілёва ўставы забаранялі перахопліваць сыравіну на тэрыторыі, прылеглай да рынку. Усе азначаныя гандлёвыя аперацыі павінны былі адбывацца на рынкавым пляцы [20, с. 345].

Рамесныя брацтвы ў сваіх уставах нармавалі і рынкавыя меры продажу. Так, напрыклад, масларобам Магілёва цэхавая вярхушка загадала, што «...гляки на проданье олею мают быша ровныя, поцехованыя (пазначаныя пячаткай цэха), также мают быти кварты ровные» [3, л. 4].

Яшчэ адным крокам цэхавага кіраўніцтва па забяспячэнні сваіх інтарэсаў у горадзе была забарона правозіць з іншых мясцін на рынак і прадаваць тут рэчы, аналагі якіх выпрабляла мясцовае рамесніцтва. Гэта сведчыць аб імкненні цэхавай вярхушкі, магістрата горада штучна стварыць манапольныя ўмовы для продажу ўласных тавараў. Мяшчане і купцы атрымлівалі пераважнае права на гандаль некаторымі катэгорыямі тавараў. Напрыклад, грамата Жыгімонта III Вазы гародзенскім мяшчанам надавала ім манапольнае права скупкі збожжа і яго экспарту ў краіны Заходняй Еўропы па Нёману, а таксама імпарту солі і селядцоў [5, с. 13]. Як сведчаць дадзеныя мытных кніг Упітскай і Гарадзенскіх камор і Юрбаркскага прыкаморка, соль і селядцы былі асноўнымі катэгорыямі тавараў, якія ўвозіліся на тэрыторыю ВКЛ з партоў Балтыйскага мора, а збожжа асноўным экспартным таварам [8, с. 34]. Таму наданне мяшчанству манапольнага права гандлю гэтымі катэгорыямі тавараў сведчыць аб жаданні

вярхоўнай улады ўмацаваць карпаратыўную структуру горада з мэтай павелічэння аб'ёму падаткаў у гаспадарскі скарб [21, с. 214].

Рамеснікі былі не адзіныя ў сваім імкненні да аб'яднання. Купецтва таксама рабіла спробы ў гэтым напрамку. У аб'яднанні купцы шукалі і магчымасць супрацьстаяння канкурэнцыі з боку іншагародніх гандляроў. Членам купецкага брацтва мог быць любы жыхар горада, які быў унесены ў спісы купцоў, даў прысягу магістрату аб тым, што будзе прытрымлівацца ўстава брацтва і дзяржаўнага заканадаўства, і заплаціў грашовы ўнесак. Паколькі сума гэтага ўнеску была даволі значная, членамі купецкіх брацтваў або гільдый станавіліся заможныя або сярэднія купцы, дробныя гандляры дзейнічалі па-за межамі карпарацый. Так, напрыклад, ва ўставе купецкага брацтва Магілёва ўзгадваецца «об ущербе и обидах... о препятствии в торговли и купеческих занятиях, которые приносят чужие люди и приезжие, не имеюше основания пользоваться магдебургским правом, а также привилеями и вольностями...» Дарэчы, брацкая ўстава нармавала і ўнутраную канкурэнцыю. Ніхто не павінен быў апярэджваць іншага ў куплі і рэалізацыі тавару. Купцу забаранялася «перахоплівацць» гандляроў, якія прыехалі, да таго, як яны, згодна з законамі горада, прыедуць на пастаялыя двары, размесцяцца тут і пачнуць гандляваць [25, с. 53].

**Заключэнне**

З'яўленне інстытуту прыгоннага права на беларускіх землях было звязана са станаўленнем феадальнага фальварку як прадпрыемства, якое працуе на рынак і пастаўляе туды сельскагаспадарчую прадукцыю. Рост колькасці сельскагаспадарчай прадукцыі на ўнутраным рынку садзейнічаў урбанізацыйным працэсам у ВКЛ. Рост насельніцтва суправаджаўся ўскладненнем сацыяльнай структуры горада і з'яўленнем такіх юрыдычных інстытутаў, як магістрат, цэхі, брацтвы. Асобую ўвагу трэба ўдзяліць прыватнаўласніцкім юрыдыкам у беларускіх гарадах. Без росту сельскагаспадарчай вытворчасці і развіцця ўнутранага рынку памешчыкам было б немагчыма насяляць гарадскія тэрыторыі рамеснікамі і такім чынам атрымліваць даход ад іх дзейнасці. Таму інстытут прыгоннага права, з аднаго боку, стрымліваў рост гарадоў, а з другога – ускосна садзейнічаў іх развіццю як цэнтраў рамяства і гандлю.

*ЛИТЕРАТУРА*

1. Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов: в 39 т. – Вильна, 1865–1915. – Т. 24: Инвентари и разграничительные акты (1558–1784 гг. ) – 614 с.

2. Archiwum Glywny Akt Dawnych – Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве Archiwum Radziwilow dz. II ф. № 444. л. 1–8.

3. Archiwum Glywny Akt Dawnych – Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве Archiwum Radziwilow dz. II ф. № 347. л. 1–4.

4. Archiwum Glywny Akt Dawnych – Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве Archiwum Radziwilow dz. II ф. № 444. л. 43–45.

5. Бохан, Ю. М. Мястэчкі вярхоўяў Віліі і Неманскай Бярэзіны ў XV–XVIII стст. (па археалагічных і пісьмовых крыніцах) / Ю. М. Бохан. – Мінск, 1994. – 220 с.

6. Бродель, Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. Т. 1 / Ф. Бродель – М.: Прогресс, 1986. – 623 с.

7. Бродель, Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. Т. 2 /Ф. Бродель – М.: Прогресс, 1988. – 634 с.

8. Бродель, Ф. Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. Т. 3 / Ф. Бродель – М.: Прогресс, 1992. – 678 с.
9. Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI – XVIII вв. (социально-экономическое исследование истории городов) / А. П. Грицкевич – Минск: Наука и техника, 1975. – 245 с.
10. Копысский, З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский. – Минск : Наука и техника, 1966. – 227 с.
11. Копысский, З. Ю. Социально-политическое развитие городов Беларуси в XVI – первой половине XVII вв. / З. Ю. Копысский. – Минск: Наука и техника, 1975. – 193 с.
12. Литовская метрика. Ред. Гудавичус Э. / Э. Гудавичус. – Вильнюс: Минтис, 1997. – Кн. 1. – 423 с.
13. Макараў, М. Прававое становішча местаў Беларускага Падзвіння ў XIV – першай палове XVII ст. / М. Макараў. – Мінск: Экаперс-пектыва, 2008. – 248 с.
14. Марк Блок. Феодальное общество / Блок Марк – М.: Изд-во им. Сабашниковых, 2003. – 504 с.
15. Марчук, Н. Н. К вопросу о социальных революциях: Якобинская схема и освободительная борьба в Латинской Америке конца XVIII – нач. XIX вв. / Н. Н. Марчук – М.: Изд-во Рос. ун-та дружбы народов, 1993. – 160 с.
16. Пичета, В. В. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. /В.В. Пичета. – М.: Просвещение, 1958. – 345 с.
17. Пичета, В. В. Белоруссия и Литва в XV – XVI веках / В. В. Пичета. – М.: Просвещение, 1961. – 367 с.
18. Риер, Я. Г. Аграрный мир Восточной и Центральной Европы в средние века по археологическим данным / Я. Г. Риер – Могилев : Издательство Могилёвского государственного ун-та имени А. Кулешова, 2000. – 402 с.
19. Рябцэвич, В. Н. Нумизматика Беларуси / В. Н. Рябцэвич. – Минск: Полымя, 1995. – 687 с.
20. Сапунов, А. П. Витебская старина / А. П. Сапунов. – Витебск, 1883. – Т. 1.
21. Улашчык, Н. Н. «Устава на валокі»: [1557, закон аб правядзенні валочнай памеры] // БелСЭ. – Мінск, 1974. – Т. 10.
22. Ястребицкая, А. Л. Малые города как проблема сравнительно-исторического изучения европейского средневекового города // Средние века. – Вып. 51. – 1988.
23. Ammann, H. Über das Waadtländische Städtewesen im Mittelalter und über landschaftliche Staatswesen in allgemeinen Mittealter. Munchen 1979. – 567c.
24. St. Alexandrowicz Zaludnienie miasteczek Litwy i Białorusi w XVI i pierwszej połowie XVII wieku // Roczniki Dziejów Społecznych i Gospodarczych. – T. 27. – Poznan, 1965.
25. Stanisław Alexandrowicz "Geneza i rozwoj sieci miasteczek Bialorusi i Litwy do polowy XVII w. // Acta BalticaSlawica. T. 7. Bialostok, 1970.

# THE IMPACT OF THE INSTITUTE OF SERFDOM IN THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA ON URBANIZATION PROCESSES XVI – THE FIRST HALF XVII CENTURIES

**© 2019 A. V. KISIALIOU[1]**

*The Belarusian State Agricultural Academy, Gorki, Belarus*
*[1]E-mail: solo225@rambler.ru*

The purpose of the study is determination of the characteristics, evolution and organization of domestic commerce in the Belarusian lands of the Grand Duchy of Lithuania in the 16th – the first half of the 17th centuries. The history of Belarus, the history of the Eastern Slavs.

**Keywords:** Belarus, the Grand Duchy of Lithuania, trade (commerce), market, money, real estate, promissory note, merchants, prosols, prices, income, right, shop.